# Тэматычнае мерапрыемства
# " Героі касмічных прастораў"   для людзей сталага ўзросту.

13 красавіка 2021 года ў аддзяленні дзённага знаходжання для грамадзян сталага ўзросту ДУ "ТЦСАН Ашмянскага раёна" прайшло тэматычнае мерапрыемства, прымеркаванае Дню касманаўтыкі, арганізаванае супрацоўнікамі аддзялення сумесна з выкладчыкамі УА "Ашмянская Дзіцячая школа мастацтваў".

Сустрэча атрымалася пазнавальнай, цікавай і музычнай. Падчас мерапрыемства прысутныя акунуліся ў гістарычны экскурс касманаўтыкі, адказы на інтэлектуальныя "касмічныя" пытанні прадэманстравалі веды і эрудыцыю пажылых грамадзян. Музычная віктарына "Адгадай касмічную мелодыю", падрыхтаваная выкладчыкамі Школы мастацтваў, дапамагла ўспомніць выдатныя песні пра космас і яго герояў  і стварыць сапраўдную атмасферу свята.



